*Л.Г. Бараноўская*

# МІФАПАЭТЫЧНЫЯ ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ АНІМАЛІСТЫКІ

Са старажытных часоў жывёлы займаюць значнае месца ў практычнай дзейнасці людзей і ў іх вераваннях. Яшчэ ў дабіблейскія часы чалавек асэнсоўваў сябе праз аналогіі з жывёльным светам. Усё жыццё людзей было прасякнута міфалагічнымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени

ўяўленнямі. Але спачатку міфы, відаць, не расказваліся, а выяўляліся ў форме рытуалаў, абрадаў. Сведчаннем таму стала шырокае выкарыстанне зоамарфічных вобразаў у сферы сімволікі (голуб – сімвал міру), эмблематыкі (змяя ў медыцыне), геральдыкі (арол на гербе князёў Радзівілаў, конь на гербе Пагоня). Успомнім назвы некаторых хвароб (рак, жаба), будаўнічых і іншых канструкцый (канёк). Шырока распаўсюджаны анімалістычныя назвы ў казках, гульнях, ласкавых словах, цацках у выглядзе жывёл – у розных метадах і формах пры выхаванні дзяцей. Вусная народная творчасць, моўны матэрыял, старажытная сімволіка з'яўляюцца тымі вытокамі, якія дазваляюць рэканструіраваць сувязі жывёл з чалавекам у міфілагічным аспекце.

Здаўна людзі называлі звяроў старэйшымі братамі, а часам нават лічылі іх сваімі продкамі. Невыпадкова гісторыя развіцця культуры пачалася з розных форм зоацэнтрызму: жывёл на пачатковай стадыі развіцця чалавецтва лічылі святымі, уяўлялі іх як асобую іпастась чалавека, ад прадстаўнікоў фауны выводзілі паходжанне калектыву. На змену зоацэнтрызму, які ўзвышаў жывёлу над чалавекам, прыйшоў антрапацэнтрызм, які вылучыў чалавека са свету прыроды і ўзвысіў над гэтым светам; змяніліся адносіны паміж чалавекам і жывёламі. Тым не менш, роля прадстаўнікоў фауны ў духоўным жыцці чалавецтва даволі вялікая.

Факты шанавання свяшчэнных жывёл, якіх нельга было забіваць і крыўдзіць, добра вядомы. Гаворка ідзе пра татэмізм – "*комплекс вераванняў, абрадаў і рытуалаў у першабытным грамадстве, звязаны з уяўленнем аб роднасці паміж групай людзей (родам, фратрыяй) і татэмам (пэўным відам жывёл, птушак, раслін, радзей з'яваў прыроды і неадушаўлёнымі прадметамі)*" [4. С. 368-369].

Тэрмін "татэмізм" (у перакладзе з мовы паўночных індзейцаў плямені аджыбве – "яго род") упершыню быў выкарыстаны Дж. Лонгам у XVIII ст. Вызначэннем яго спецыфікі займаліся выдатныя дзеячы XIX – XX стст.: англійскія этнолагі Э. Тэйлар ("Першабытная культура") і Дж. Фрэзер ("Залатая галіна"), аўстрыйскі псіхааналітык З. Фрэйд ("Татэм і табу"). Іх працы сталі арыенцірамі для навукоўцаў, якія распрацоўвалі ў далейшым вывучалі міфалагічнае і мастацкае мысленне. Галоўнае палажэнне гэтых даследаванняў: татэм – не боства,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

галоўнае ў татэмізме – вера ў радство з ім. У кожнага народа свету склалася свая сістэма татэмных продкаў (у вялікай колькасці яны вядомы ў аўстралійцаў, набор іх татэмных продкаў – літаральна ўся фауна мацерыка).

Адгалоскі татэмізму праявіліся ў славянскай культуры ў абрадавым фальклоры, які звязаны з шанаваннем дрэў, птушак, звяроў. Вядомымі даследаваннямі татэмізму ў славянскай культуры з'яўляюцца фундаментальныя працы "Тотемический культ деревьев у русских и белорусов", "Идеологическое перенесение на диких животных социально-родовой организации людей" рускага этнографа і фалькларыста Д. Зяленіна. Да разгляду татэмізму звярнулася беларуская даследчыца Т. Шамякіна: "*У беларускіх народных абрадах і сёння мы знаходзім шмат рэшткаў татэмізму: пераапрананне ў скуры жывёл, жывёльныя маскі, "ваджэнне казы" на Каляды, прысутнасць "духа поля" на дажынках, кажух, на які саджаюць маладых падчас вяселля (раней гэта была шкура татэмнай жывёлы)*" [9. С. 21].

Спецыфічнай формай праяўлення татэмізму ў беларусаў з'яўляюцца пераапрананні ў скуру мядзведзя, казы падчас розных свят і абрадаў. Гэты абрад мае даўнюю гісторыю, у асобных беларускіх фальклорных творах адзначаецца, што ў мядзведзяў, буслоў, ваўкоў часам ператвараліся (пераважна па волі Бога) звычайныя людзі. "*Татэмізм – гэта не толькі вера ў жывёльнага продка, але і перакананне, што некаторыя члены роду могуць ператварацца ў татэмную жывёлу*" [9. С. 19], – адзначае Т. Шамякіна. Адсюль вера ў пярэваратняў ("*фантастычны персанаж народных павер'яў і казак; чалавек, ператвораны ці здольны сам дзівосным чынам ператварацца ў звера, расліну, камень*" [4. С. 310]). На Беларусі да цяперашняга часу распаўсюджаны фальклорныя творы пра пераўвасабленне чалавека ў прадстаўнікоў фауны (мядзведзя, лася, казу, ваўка).

Такім чынам, шэраг твораў вуснай паэтычнай творчасці захоўваюць рэшткі татэмізму. Фальклорнае мастацтва найбольш поўна захавалася ў міфалагічным мысленні. Татэмныя міфы з'яўляюцца аднымі з самых старажытных у свеце. Найбольшае распаўсюджанне яны атрымалі сярод народаў Еўразіі і Паўночнай Амерыкі. У гэтых міфах продак, ад якога пачыналася племя, выступае ў выглядзе жывёлы або здольны ў яе пераўтварацца.

Акрамя татэмічных, анімалістычныя вобразы прысутнічаюць і ў іншых міфах: касмаганічных (пра ўзнікненне свету),

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

этыялагічных (пра паходжанне і ўласцівасці аб'ектаў і з'яў прыроды) і г.д.

Цяжка пераацаніць ролю анімалістычных міфаў у раскрыцці самасвядомасці чалавека. Яны сведчаць аб асацыятыўным успрыманні, калі анімалістычныя элементы з'яўляліся фіксатарамі пры адлюстраванні розных з'яў рэчаіснасці. З жывёламі людзі суадносілі краіны свету, стыхіі, поры года і г.д. Прычым кожны народ або краіна мае сваю сістэму гэтых вобразаў. Так, калі мы возьмем прыродныя стыхіі, мы пераканаемся, што полымя ў народаў Кітая і Японіі асацыіруецца з Феніксам, у Старажытнай Грэцыі – з драконам. Аналіз такіх сістэм дапамагае асэнсаваць асаблівасці, каларыт, сутнасць светапогляду гэтых народаў, пэўных рэлігій.

Адной з асаблівасцей беларускай міфалогіі, якая адлюстравана ў літаратуры, з'яўляецца тое, што ў ёй выяўляецца сінтэз язычніцкага і хрысціянскага пачаткаў. У абодвух сістэмах спачатку вылучаюцца жывёлы, а потым чалавек. Паводле язычніцкага светапогляду жывёлы шанаваліся. Чалавек стаяў на ніжэйшай ступені лесвіцы, не ўзвышаўся над прыродай, а лічыўся яе адзінкай, часткай цэлага. Адваротны пункт гледжання дае хрысціянства. Паводле Старога Запавету, чалавек – уладар ўсяго жывога.

Элементы міфалагічных уяўленняў захаваліся ў фальклорных творах: у легендах, валачобных, купальскіх, вясельных песнях, казках, баладах, замовах, пахавальных галашэннях і г.д. Напрыклад, на Беларусі пашыраны легенды пра князяваўкалака Усяслава Чарадзея, аднаго з герояў "Слова аб палку Ігаравым". У творы аўтар малюе князя як чараўніка, які мог ператварацца ў ваўка, сокала, нечакана знікаць і зноў з'яўляцца ў самых розных мясцінах Русі.

Многія легенды, паданні адлюстраваны ў беларускай мастацкай літаратуры другой паловы XX ст. У сучаснай літаратуры Беларусі, калі пашыралася, узмацнілася выкарыстанне анімалістычных вобразаў, нярэдка вобразы фауны паўстаюць у традыцыйным для беларускага фальклору кантэксце. Прыкладам могуць паслужыць фальклорныя творы пра бусла, які з'яўляецца самым распаўсюджаным арніталагічным вобразам ў мастацкай свядомасці беларусаў. Аб гэтым сведчаць розныя легенды і паданні этыялагічнага, касмаганічнага плана ("Пра паходжанне бусла", "Пакаранне бусла", "Бусел", "Лясныя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

манахі”). Паводле гэтых твораў, бусел – гэта чалавек, якога Бог ператварыў у птушку за непаслухмянасць. Аднойчы, паддаўшыся цікаўнасці, чалавек раскрыў мяшок, які Гасподзь даручыў яму кінуць у полымя (варыянт – у прорву), не развязваючы. З мяха вылезлі гады, розная нечысць і распаўзліся па зямлі. Ператварыўшы чалавека ў бусла, Бог прымусіў збіраць іх. Гэта легенда знайшла ўвасабленне ў шэрагу літаратурных твораў Беларусі. Сярод іх – “Народная казка пра бацяна” У. Дубоўкі, нарыс “Зямля пад белымі крыламі” У. Караткевіча, аповесць “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел” В. Казько, апавяданне “Бусел” А. Кажадуба.

Такім чынам, вобраз бусла шырока прадстаўлены ў творчасці беларускіх аўтараў, мае шэраг нацыянальных асаблівасцяў. У многіх творах разглядаецца як татэмная птушка, сімвалізуе паходжанне беларусаў як народа[1].

Для таго каб паўнавартасна разгледзець мастацкую анімалістыку і звязаную з ёй вобразную сістэму, неабходны звярнуцца да архетыпаў, якія грунтуюцца на міфатворчай аснове. Першая згадка пра архетыпы сустракаецца ў антычным платанізме (па Платону – вобраз), непасрэдна сам тэрмін “архетып” быў уведзены ў шырокі культурны ўжытак швейцарскім псіхааналітыкам і міфолагам К. Юнгам (“Аб архетыпах”, 1937). Асновай яго тэорыі з’явілася тэорыя “калектыўнага падсвядомага”. На думку вучонага, само несвядомае пастаянна прадуцыруе некаторыя схемы (архетыпы). Гэтыя апрыёрныя схемы ўвасабляюцца ў вобразы, сюжэты і матывы, вар’іруюцца ў розных рэгіёнах, у творчасці самабытных народаў.

Не менш значнай для літаратуры з’яўляецца і распрацаваная Юнгам у межах ідэі пра адзінства форм чалавечага ўяўлення канцэпцыя функцыянальнай ролі мастака: першая функцыя – “лекар”, другая – сацыяльная. Першая функцыянальная роля звязана з талентам мастака ўзнаўляць архетыпічныя формы. Другая роля – сацыяльная – важная для пісьменніка, па Юнгу, тым, што ў пэўнай ступені мае гістарычную аснову.

---

[1] Адзначым, што бусел у якасці “нацыянальнай птушкі” – тэрмін прыняты Міжнародным саветам абароны птушак у 1960 г. – прыпісаны да Германіі. Тым не менш, аналізуючы мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў, заўважым, што ў нашай краіне гэта прызнаны нацыянальны вобраз, сімвал Радзімы, чысціні. Вобраз такога плану ў літаратуразнаўстве XX ст. прынята называць архетыпічным.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Першаступеннае значэнне для тэарэтычных і метадалагічных асноў пры даследаванні архетыпаў літаратурнага твора маюць ідэі такіх вядомых расійскіх вучоных, як А. Афанасьеў, С. Аверынцаў, М. Бахцін, Ю. Бораў, В. Халізеў, В. Якушава і інш.

Увядзенне паняцця архетыпу стала штуршком для новага погляду на творы мастацтва, пачало выкарыстоўвацца пры аналізе вобразнай сістэмы літаратурных твораў. Мастацкія вобразы, якія ствараюцца падсвядома, актывізуюць уяўленне, рэалізуюцца ў міфах. Сёння існуюць розныя падыходы да вызначэння паняцця архетып: адны *"разумеюць пад ім матывы, вобразы, якія паходзяць з міфаў, рытуалаў"*, другія *"тлумачаць архетып ў паэзіі як ідэю, персанаж, аб'ект, выпадак, якія маюць, першасныя, універсальныя рысы і выяўляюцца крытыкамі шляхам параўнальнага аналізу з міфамі і рытуаламі"* [3. С. 65]. Мэтазгодна ў адносінах да літаратуры разглядаць архетып як вобраз. Гэтага ж пункту на архетып прытрымліваюцца прадстаўнікі айчыннага літаратуразнаўства. *"У літаратуры архетып канкрэтузуецца ў шэрагу арыгінальных вобразаў, паўтараючыся ў розных нацыянальных пісьменствах і ў розныя перыяды. Так, архетып самаахвярнасці чалавека дзеля іншых людзей увасобіўся і ў класічным вобразе Праметэя, і ў вобразе Сотнікава (з аднайменнай аповесці В. Быкава). Архетып вясны, адраджэння знайшоў увасабленне і ў славутых казаннях Кірылы Тураўскага (XII ст.), і ў паэзіі Я. Купалы (XX ст.)"* [5. С. 41].

Пэўныя вынікі ў даследаванні ролі і функцыяніраванні архетыпаў у фальклоры і літаратуры выкладзены ў асобных працах А. Ненадаўца («За смугою міфа» і інш.), Т. Шамякінай («Беларуская класічная літаратура і міфалогія», «Міфалогія Беларусі» і інш.), А. Чароты ("Пошук спрадвечнай існасці").

Тым не менш, у беларускім літаратуразнаўстве пакуль што няма адзінай цэласнай канцэптуальнай працы, прысвечанай праблеме функцыянавання архетыпаў у мастацкай літаратуры Беларусі, дзе б быў сістэматызаваны ўвесь фактычны матэрыял, улічаны найноўшыя дасягненні ў галіне псіхалогіі, філасофіі і замежнага літаратуразнаўства. Адно з першых даследаванняў у гэтым кірунку – праца У. Конана "Архетыпы нашай культуры", у якой ён робіць спробу прэзентаваць сістэму архетыпаў беларускай культуры, выкарыстоўвае пры гэтым даследаванні айчынных і замежных фалькларыстаў. Аўтар



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паказвае вытокі фарміравання архетыпаў, аднак далейшае іх функцыянаванне ў літаратуры Беларусі разгледжана фрагментарна. Сярод зоаморфных элементаў У. Конан даследуе наступныя архетыпы: ваўка, змяі, казы, каня, жабы, мядзведзя, пеўня і г. д.

Тэорыя архетыпаў асабліва актуальная пры аналізе літаратурных твораў беларускіх аўтараў. Прыкладам матываванага выкарыстання значных архетыпічных форм культуры і быту з'яўляецца творчасць класікаў беларускай літратуры Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, К. Чорнага, У. Караткевіча і г. д. Асабліва багаты ідэйна-тэматычны пласт мастацкая анімалістыка складае ў літаратуры Беларусі другой паловы XX ст. У аснове сімволікі, семантыкі вылучанага вобраза, якая выяўлена ці ўвасоблена на інтуітыўным ўзроўні, якраз ляжыць такая з'ява як архетып.

Сказанае вышэй дазваляе зрабіць выснову, што пастаяннае ўзаемадзеянне літаратуры і міфалогіі адбываецца непасрэдна, у форме выкарыстання міфа ў мастацкім творы, і апасродкавана – праз жывапіс, рытуалы, народныя святы, фальклор, а ў апошні час – праз навуковыя канцэпцыі міфалогіі, эстэтычныя і філасофскія вучэнні. Павышаная ўвага да архетыпічнасці ў мастацтве характэрна для сучаснага даследавання сусветнай літаратуры мінулых і цяперашняга стагоддзяў. Архетыпы знаходзяць у творчасці самых розных пісьменнікаў. *"Мастак – чалавек з дзіўнай чуйнасцю якраз да архетыпаў. Той, хто адэкватна архетыпы выяўляе, робіцца геніем на многія стагоддзі, бо гаворыць пра рэчы, важныя і цікавыя для ўсіх"* [1. С. 364], – адзначае Т. Шамякіна. Персаніфікацыя навакольнага свету, экалагічнай, духоўнай сувязі паміж усім жывым на зямлі сведчыць пра адзінства светабудовы, прасякнутасць чалавека і прыроды архетыпічнымі сітуацыямі, вобразамі, матывамі.

**Літаратура:**

1. Беларуская літаратура: XI – XX стст. Дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А.І. Бельскі, У.І. Кароткі, П.І. Навуменка і інш. – 2-е выд., дапрац. – Мінск, 2001.
2. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск, 2004.
3. Литературознавчий словник-довідник / Р.Т. Гром'як, Ю.І. Ковалів та ін. – К., 1997.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Народная культура Беларусі: Энцыкл. давед. / Пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск, 2002.
5. *Рагойша В.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: Дапам. — Мінск, 2001.
6. *Тайлор Э.Б.* Первобытная культура / Пер. с англ. – М., 1989.
7. Фрэзер Д.Д. Золотая ветвь: Исследование магии и религии / Пер. с англ. – М., 1986.
8. *Чарота І.А.* Пошук спрадвечнай існасці: Беларус. літ. XX ст. у працэсах нацыянальнага самавызначэння. – Мінск, 1995.
9. *Шамякіна Т.І.* Міфалогія Беларусі: Нарысы. – Мінск, 2000.
10. *Юнг К.Г.* Архетип и символ. – М., 1991.